# ДУХОЎНАСЦЬ ЯК АСНОВА МАСТАЦКАЙ КАНЦЭПЦЫІ ГІСТОРЫІ В. ІПАТАВАЙ

А.У. Сузько
УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна

Клопат пра сваю радзіму, малітва за яе матэрыяльны і духоўны дабрабыт заўсёды былі і застаюцца вызначальнымі ідэйна-мастацкімі імператывамі для любога пісьменніка. Грамадзянскасць гучання літаратурнага твора і на сённяшні момант не страчвае сваёй актуальнасці.

Відаць, таму В. Іпатава, пісьменніца, што ўсю сваю творчасць прысвяціла асэнсаванню гістарычнага шляху Беларусі, вяртанню суайчыннікам страчаных ці забытых культурных і духоўных каштоўнасцей, апелюе ў сваім чарговым творы, аповесці “Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба”, да праблемы гістарычнай памяці, аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Яна стварыла мастацкае палатно, што па сутнасці ўяўляе сабой своеасаблівае ўшанаванне святых пакутнікаў “беларускага паходжання”. Штуршком для напісання твора сталі для пісьменніцы скупыя звесткі, запазычаныя з розных гістарычных крыніц, а таксама пралогавай аповесці “Мучэння святых наваяўленых мучанікаў родам з Літвы Іаана, Антонія і Яўстафія”, якая захавалася толькі ў сербскай рэдакцыі XIV стагоддзя [1, с. 181].

Цікавасць пісьменніцы да постацяў святых Іаана, Антонія і Яўстафія (свецкія імёны Круглец, Няжыла, Кумец) невыпадковая. Сярод уласна беларускіх падзвіжнікаў хрысціянства найбольш вядомыя імёны Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Клімента Смаляціча і інш. Як заўважаем, спіс не ўражвае шматлікасцю постацяў, але значнасць іх укладу ў агульнахрысціянскую духоўную спадчыну невымерная. Відавочна, В. Іпатавай кіравала жаданне папоўніць культурную скарбніцу беларускага

МГПУ им. И.П. Шамякина

народа і паказаць выключны маральна-духоўны яго патэнцыял. Мошчы вышэй згаданых пакутнікаў з’яўляюцца агульнай праваслаўнай святыняй, аднак беларусы ў гэтай сітуацыі аказаліся чарговы раз абрабаванымі, бо літоўскі народ прылічвае іх да сваіх нацыянальных рэліквій.

Як сапраўдная патрыётка сваёй Радзімы В. Іпатава не магла не думаць пра нябесных ахоўнікаў, святых, духоўная падтрымка якіх неабходна любому народу ў самыя пераломныя і адказныя моманты гісторыі і сучаснасці. Пісьменніца ў прадмове да аповесці “Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба” прызнавалася: “У гэтай аповесці мне хацелася звярнуцца да тых старонак беларускай гісторыі, якія складаюць яе духоўную славу і якія павінны быць адноўленыя, каб над нашай краінай прасціралася ахоўная моц пакутнікаў, якіх ушанавалі яшчэ ў XIV стагоддзі і якія, як вечная загадка для атэістаў, засталіся нятленнымі ў свеце, дзе рассыпаюцца камяні і царствы…” [2, с. 5].

Такім чынам, ідэйным каркасам аповесці В. Іпатавай сталі дакументальныя звесткі пра трох віленскіх пакутнікаў, якія яна ўзбагаціла змястоўным, па-мастацку пераканальным творчым вымыслам.

Прычынай страшнага пакарання прыхільнікаў хрысціянства, паводле “Памяці святых наваяўленых пакутнікаў Антонія, Іаана, Яўстафія”, стала іх публічная адмова есці мяса ў пост і галіць бараду [3, с. 140–143]. В. Іпатава, выкарыстоўваючы традыцыі старажытных жыцій і хаджэнняў, спрабуе ўзнавіць гісторыю свецкага жыцця, пакутаў і смерці беларускіх святых.

Праз усе творы В. Іпатавай праходзіць думка пра вечнасць духоўных каштоўнасцей, сцвярджаецца іх прыярытэт для самасцвярджэння народа, нацыі, краіны. Згадаем Жывену з рамана “Залатая жрыца Ашвінаў”, што дбала найперш пра захаванне жывой, цнатлівай душы, насуперак неспрыяльным і жорсткім жыццёвым абставінам; Ляздзейку з “Вешчуна Гедзіміна”, які, з’яўляючыся напачатку княскім вешчуном, а пасля і вярхоўным жрацом, марыць пра свабоду, чалавечую і творчую, усведамляючы, што ў барацьбе за ўладу людзі забыліся пра святое, страцілі чалавечнасць, абмянялі вечнае на мітуслівае, імгненнае.

У творы В. Іпатавай відавочныя сувязі з нацыянальнай і еўрапейскай мастацка-гістарычнай традыцыяй. Так, аповесць “Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба” мае пэўныя ідэйна-мастацкія паралелі з раманам польскага пісьменніка Г. Сянкевіча “Куды ідзеш?”, дзе ён паказвае першых хрысціян як ахвяр прыдворных інтрыг, барацьбы за ўладу і сферы ўплыву. Толькі, у адрозненне ад паталагічна жорсткага тырана Нерона, князь Альгерд у творы В. Іпатавай сам з’яўляецца ахвярай палітычнай сітуацыі ў краіне.

У той жа час В. Іпатава адлюстроўвае беларускую мінуўшчыну ў рамантычным ключы, характэрным для творчага метаду У. Караткевіча. Героі В. Іпатавай апантаныя ідэяй духоўнага і маральна-этычнага

МГПУ им. И.П.Шамякина

абнаўлення свету, усеагульнага быцця на аснове прынцыпаў дабра, праўды, справядлівасці, любові. Згадаем, як Круглец (Іаан) разважае: “Свет, хаця і стаіць ён сёння на патрэбе для самога сябе, не павінен быць такім. А калі дапаможаш іншаму – атрымаеш такую радасць, якой ня ведаеш, калі зрабіў нешта толькі для сябе…”[2, с. 22]. Паводле законаў рамантычнага пісьма, побач з ідэальным светам існуе свет цемры, зла. Яго ўвасабленнямі на старонках аповесці з’яўляюцца жрацы (Мікша, Бурыла, Нара, Дзівейна), якія з дапамогай маны і злачынстваў імкнуцца ўтрымаць у сваіх руках вярхоўную ўладу, прымушаюць Альгерда пакараць смерцю Кумца, Кругляца і Няжылу. Горкую праўду пра непазбежнасць крызісу язычніцтва В. Іпатава ўкладвае ў вусны сумленнага і шчырага служкі культу Лойкі, які непакоіцца за “жрэчаства, якое пакуль што вяло народ па духоўнай сьцяжыне, але непазбежна павінна было страціць уладу і магутнасць, таму што даўно страціла глыбінную чысціню сапраўдных ведаў і сувязі з Небам” [2, с. 186–187]. Так, аўтар вырашае праблему ўзаемаадносінаў народа і ўлады, свецкай і духоўнай, і, разам з тым, злучае далёкую гісторыю і сучаснасць.

Невыпадкова В. Іпатава абрала для сваёй аповеду пераломны момант гісторыі Вялікага княства Літоўскага як у плане светапоглядным, так і ў плане гістарычным. Яе зацікавіў момант супрацьстаяння дзвюх моцных светапоглядных сістэм: язычніцтва і хрысціянства. Пісьменніца паказвае ўсю складанасць пераходу да новай формы свядомасці, складанасць разбурэння псіхалагічных стэрэатыпаў і кансерватыўнасці мыслення. Ды і сама пісьменніца, відаць, разумее каштоўнасць духоўнага вопыту і язычніцтва, і хрысціянства. Недарэмна яна так падрабязна апісвае сцэну спрэчак паміж вязнем Кумцом і жрацом Лойкам:

“ – … Чарната апаноўвае свет. Мы ідзём не шляхам праўды, дабрыні і спагады, а нянавісці, хцівасці і зайздрасці. Людзям няма выратавання, апроч як прыняць закон ахвярнасці, што даў нам праз Хрыста Ўсявышні. Усяго дзесяць законаў! Яны такія простыя – і такія неверагодна цяжкія! А што прапануе сёння язычніцтва?

– Ты кажаш – сёння. Так, сёння і язычніцтва ўжо не дасканалае. Але і ў ім жыве спагада, і галоўнае – у ім радасць жыцця, паўната чалавечага існавання і пакланенне прыгажосці прыроды!” [2, с. 186].

Менавіта Лойка зразумеў тую ісціну, што язычніцтва зжыло сябе, і ў гэтым яго найвялікшая драма. Бо менавіта Кумцу, а не яму, пасрэдніку паміж людзьмі і багамі, адкрылася боская таямніца; не яму была дадзена магчымасць дакрануцца да Дрэва Жыцця, прычым, не язычніцкага дуба, а срэбнай яблыні з залатымі яблыкамі, сімвала боскай літасці, мудрасці, райскага дрэва. Так, В. Іпатава паказвае цягу чалавека да новых духоўных гарызонтаў. Сапраўды, язычніцтва ўжо не задавальняла духоўныя патрэбы чалавецтва. Відаць, недарэмна твор пачынаецца апісаннем ахвярапрынашэння маладой і прыгожай дзяўчыны Векшы. Кроў, што

МГПУ им. И.П.Шамякина

лілася ракой, абурыла пакуль яшчэ толькі аднаго чалавека, Кумца, які не можа і не жадае змірыцца з такой жорсткасцю і несправядлівасцю. Адказы на пытанні, што нараджаюцца ў яго душы, ён знаходзіць у хрысціянскім храме.

Увогуле, хрысціянства высока ацэньвае ачышчальную сілу пакут – не як самамэты, але як самай моцнай зброі ў вайне са злом свету. Толькі “прымаючы свой крыж”, чалавек, паводле хрысціянскага разумення, здолее перамагчы зло ў самім сабе і вакол сябе.

Відаць, таму так катэгарычна і прынцыпова абараняе сваю веру Кумец, адмаўляецца ад уцёкаў з вязніцы, мужна прымае смерць. Духоўная перамога застаецца за героем: “Тут, у цямніцы, да мяне прыходзіў Усявышні… Я бачыў яго як ззянне. І гэта… дало мне такое святло! Такую радасць і такую моц!” [2, с. 113]; “А ці стане святло да мяне прыходзіць там? Там, дзе тлум, пагоня за багаццем, за ласкаю князя… дзе няма калі думаць аб тым, навошта дадзенае нам жыццё? Думаю, яно мяне пакіне. Там я стану ранейшым – трохі веры, трохі ўцехаў. І ўсё як ва ўсіх” [2, с. 113]. Праз пакуты да Кумца прыходзіць ачышчэнне, усведамленне значнасці сваёй ахвяры, а значыць, жыццё яго набывае сэнс.

Па-рознаму прыходзяць героі В. Іпатавай да Бога, яго мудрасці, да веры ў дабро і чалавечнасць. Так, да прадстаўніка тагачаснай “залатой моладзі” Кругляца, абласканага ўладай, каханнем, багаццем, боская мудрасць прыходзіць як азарэнне: “Сталася гэта ў час падарожжа ў Цар-горад, дзе сустрэлі і пранізалі душу хлопца-язычніка вочы мазаічнага Хрыста на сцяне велічнага храма святой Сафіі. Былі ў гэтых вачах тужлівасць, але адначасна і непарушны спакой, і спагада, і разуменне… Было тое, чаго не давалі навукі ва ўніверсітэце, на што не маглі знайсці адказу жрацы ў капішчах, хаця яны ведалі ходу зорак і прадказвалі зацьменні і мор” [2, с. 16]. Шчырыя, праніклівыя вочы Хрыста адказалі на ўсе пытанні, якія даўно не давалі спакою герою.

Адзін момант змяніў жыццё Кругляца цалкам, ён зразумеў каштоўнасць чалавечага жыцця і тую простую ісціну, што адзіным законам чалавечага існавання павінна быць любоў да бліжняга, да ўсяго свету: “… Ён адчуў, што ўсю ягоную істоту напаўняе нейкае новае для яго пачуццё – магутнае, як марская хваля, з тых, што нядаўна ўзносілі і кідалі іхні карабель на Понцкім моры. І гэтае пачуццё было любоўю” [2, с. 17].

В. Іпатава выдатна валодае прыёмамі псіхалагічнага пісьма. Так, пакуты сумлення Кругляца, усведамленне ім сваёй былой жорсткасці ў дачыненні да простых людзей яна параўноўвае з тым цяжарам, што цягне “няшчаснага, што ў латах трапіў пад лёд, у бездань…” [2, с. 22].

Раскаянне дапамагае герою ачысціцца і зразумець сваю абранасць. Невыпадкова ён не застаецца ў Нямеччыне, а вяртаецца на радзіму, каб праўдзіва расказаць пра тое, што з імі было і аддаць сябе пад ахоўніцтва таго бога, які ахвяруе сабой дзеля іншых. Вось і яму трэба ахвяраваць сабою дзеля

МГПУ им. И.П. Шамякина

таго, каб сведчыць ісціну – тую, якую, па ўсім бачна, перажылі Кумец і Няжыла, і якую цяпер нанова перажыў ён сам” [2, с. 183].

Няжылу дзеля таго, каб зразумець ілюзорнасць прыдворнага жыцця, яго жорсткасць і хлуслівасць, давялося прайсці праз адрачэнне ад хрысціянства. Аднак толькі праз адрачэнне адбылося яго вяртанне да Бога. Ён па-іншаму стаў глядзець на гэты свет і людзей. Таму заканамерным быў яго адкрыты пратэст супраць жыццёвай несправядлівасці. В. Іпатава паказвае своеасаблівы пераход героя з жорсткага і бесчалавечнага свету ў іншы, лагодны і пяшчотны: “…Яго ахутала залатое, мяккае святло, закалыхала, суцішыла боль і ўдары. Ён раставаў у гэтым неспазнаным святле і пачуцці ўсеабдымнасці і шчасця” [2, с. 197].

Такім чынам, В. Іпатава ў сваёй аповесці “Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба” паказала працэс духоўнага сталення чалавека, сцвердзіла неабходнасць пакаяння і духоўнага ачышчэння для ўсяго чалавецтва.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура: падручнік / А.А. Лойка. – Мінск: Вышэйшая шола, 2001. – 319 с.
2. Іпатава, В. Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба: аповесць / В. Іпатава. – Мінск: Кнігазбор, 2006. – 216 с.
3. Памяць святых наваяўленых пакутнікаў Антонія, Іаана, Яўстафія (пераклаў А. Мельнікаў) // Кніга жыцій і хаджэнняў: пер. са старажытнарус., старабел. і польск. / уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 140–143.

МГПУ им. И.П. Шамякина